ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 12 (686) | Аўторак, 5 красавіка 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Камсамольскае жыццё*

## ДЭФІЦЫТ СВЯДОМАСЦІ

**Адбыўся камсамольскі сход на эканамічным факультэце. На ім абмяркоўваліся пытанні аб студэнцкім самакіраванні і падрыхтоўцы студэнтаў эканомфака да трэцяга працоўнага семестра.**

З дакладам выступіў старшыня савета студэнцкага самакіравання факультэта Б. Клімовіч, які ахарактарызаваў яго работу за справаздачны перыяд, сказаў аб тых праблемах, якія стаяць на сённяшні дзень перад важным дэмакратычным органам студэнтаў. Затым пачаліся выбары новага яго старшыні. Трэба адзначыць, што не ўсе камсамольцы факультэта аднесліся да іх сур'ёзна. Рэкамендавалі на пасаду старшыні тых студэнтаў, хто наўрад ці змог справіцца з такім адказным даручэннем. Былі і канструктыўныя прапановы. Іх уносілі тыя студэнты, якія «хварэюць» за прэстыж свайго факультэта, а значыць, і хочуць даверыць орган самакіравання таму, хто карыстаецца павагай, аўтарытэтам у выкладчыкаў, камсамольцаў. У выніку доўгіх спрэчак, дыскусій старшынёй быў выбраны трэцякурснік Аляксандр Лаўрыненка.

Ажыўлена ішло абмеркаванне другога пытання парадку дня камсамольскага сходу — аб фарміраванні студэнцкіх атрадаў. У цэнтры ўвагі аказаўся чацвёрты курс. Вядома, што раней студэнтам пасля чацвёртага курса не абавязкова было прымаць удзел у трэцім працоўным семестры. Сёлета ж пастаўлена пытанне аб тым, каб з ліку гэтых студэнтаў стварыць ва універсітэце брыгады для работы летам на будаўніцтве новага вучэбнага корпуса ГДУ. У большасці камсамольцы ўсведамлялі неабходнасць такога рашэння кіраўніцтва універсітэта і згаджаліся з ім. Але некаторыя выказалі і адваротную думку: «Новы корпус патрэбен фізікам, няхай яны самі і працуюць на будоўлі». Тут, пэўна, адыграла ролю тое, што работа на ўзвядзенні корпуса не будзе аплочвацца.

Нельга зразумець і студэнтаў гр. 0-11, якія поўным саставам адмовіліся ехаць летам у будатрад. Тлумачылі яны гэта тым, што грошы ім наогул не патрэбны, а адпачынак — даражэй за ўсё. Такая пазіцыя камсамольцаў не можа не здзіўляць і не трывожыць.

**А. БАЛОГА,**
**старшыня прэс-цэнтра эканамічнага факультэта.**

## СТВАРАЕЦЦА КЛУБ «МІЛАСЭРНАСЦЬ»

**Дарагія сябры!**

**Мы жывём у такі час, калі сярод нас не павінна быць абдзеленых увагай пажылых людзей. А тых, хто воляй лёсу застаўся адзін, мы, моладзь, поўная сіл і энергіі, павінны не забываць!**

**Хіба цяжка проста пагаварыць са старым чалавекам, схадзіць у магазін за прадуктамі, дапамагчы па хатняй гаспадарцы, зрабіць дробны рамонт кватэры, дома?**

**Калі вам неабыякава бачыць адзінокіх старых людзей, якім нялёгка жыць без нашай дапамогі, калі ваша сэрца не заскарузла і вы жадаеце дапамагчы старым, адзінокім людзям — уступайце ў клуб «Міласэрнасць», які ствараецца пры камітэце камсамола універсітэта.**

**КАМІТЭТ ЛКСМБ ГДУ.**

## 7-га КРАСАВІКА — СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ЗДАРОЎЯ

### Ён будзе праходзіць пад дэвізам барацьбы з курэннем

Адна з самых распаўсюджаных шкодных звычак — курэнне. Па даных статыстыкі, курыць больш паловы мужчынскага і больш чвэрці жаночага насельніцтва планеты. Сярод курыльшчыкаў, на жаль, шмат студэнтаў, у тым ліку і дзяўчат.

Большасць курыльшчыкаў лічаць, што тытунь не прыносіць асаблівай шкоды. А некаторыя нават сцвярджаюць, што курэнне супакойвае ці падбадзёрвае іх. Як глыбока яны памыляюцца!

Прывыканне да цыгарэты фарміруецца паступова. Пасля пэўнага часу цяга да курэння становіцца ўсё больш моцнай, і чалавек без яго ўжо не можа абыходзіцца.

Даследаванні вучоных паказалі, што ў смолах, якія ўтвараюцца пры курэнні, утрымліваецца каля 7 тысяч розных рэчываў. Больш 30 з іх валодаюць згубным уздзеяннем на арганізм чалавека. Найбольш актыўным рэчывам, якое ўваходзіць у састаў тытуню, з'яўляецца нікацін. Ён уключаецца ў працэс абмену рэчываў і становіцца неад'емнай яго часткай. Адсутнасць у арганізме нікаціну, які стаў для яго прывычным, выклікае ў курыльшчыка раздражнёнасць, няўстойлівы настрой, парушэнне сну, пачуццё незадаволенасці, патрэбу зноў і зноў цягнуцца да цыгарэты.

У выніку ў курыльшчыка рана ці позна ўзнікаюць паталагічныя змены ў органах дыхання, страўнікава-кішэчным тракце, сасудах сэрца, мозгу, што прыводзіць да развіцця розных захворванняў, часам цяжкіх.

Вельмі згубны ўплыў аказваюць кампаненты тытунёвага дыму на сардэчна-сасудзістую сістэму. Даследаванні пацвярджаюць, што пасля выкурвання толькі адной цыгарэты сасуды каля паўгадзіны знаходзяцца ў стане спазма. Па звужаных сасудах да тканкаў і органаў паступае значна менш пажыўных рэчываў і кіслароду. Скура твару страчвае эластычнасць, прыемную свежасць, на ёй рана з'яўляюцца маршчыны. Каб «праціснуць» кроў праз вузкі прасвет сасудаў, сэрца вымушана працаваць з вялікім напружаннем.

Падлічана, што сэрца курыльшчыка робіць за суткі на 12—15 тысяч скарачэнняў больш, чым сэрца таго, хто не курыць, а крыві да органаў паступае значна менш. Сам па сабе такі рэжым работы сэрца неэканамічны, таму што пастаянная залішняя нагрузка вядзе да заўчаснага зношвання мышцы сэрца. Да таго ж і сама сардэчная мышца не атрымлівае той колькасці кіслароду, які неабходны ёй пры такой інтэнсіўнай рабоце. Усё гэта садзейнічае ранняму развіццю ішэмічнай хваробы сэрца: інфаркты ў маладым узросце сустракаюцца амаль выключна ў курыльшчыкаў.

Курэнне прыводзіць таксама да паражэння сасудаў галаўнога мозгу. Кроў абядняецца кіслародам і паступае да мозгу ў меншай колькасці, што выклікае пагаршэнне памяці, хуткую стамляльнасць, галаўныя болі. Развіваецца атэрасклярозс сасудаў галаўнога мозгу, ускладняецца цячэнне гіпертанічнай хваробы.

Надзвычай вялікую небяспеку ўяўляюць прадукты згарання тытуню для плода, які развіваецца ў арганізме будучай маці.

Узнікае пытанне: ці заўсёды вынікі курэння аказваюцца ракавымі? Канешне, не. У тых выпадках, калі чалавек усведамляе шкоду, якую яму прыносіць курэнне, і пазбаўляецца ад гэтай згубнай звычкі самастойна ці пасля спецыяльнага лячэння, паталагічныя змены ў розных органах падвяргаюцца зваротнаму развіццю.

Значыць, у курыльшчыка ёсць толькі адзін выхад: калі ён імкнецца да таго, каб яго захворванні не прагрэсіравалі і не ўзнікалі новыя, ён павінен раз і назаўсёды адмовіцца ад курэння.

**Г. ХАПЦІНЕЦ,**
**урач-тэрапеўт паліклінікі № 6, член таварыства Чырвонага Крыжа.**

*Рашэнні лютаўскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё!*

## КАДРЫ ДЛЯ ШКОЛЫ

### ЯК ІХ РЫХТУЕМ?

Многа гадоў запар мы не можам укамплектаваць тры факультэцкія спецыяльнасці студэнтамі, здольнымі да мэтанакіраванай вучобы. Веды абітурыентаў неглыбокія, трымаюцца непрацяглы час, бо заснаваны на механічным запамінанні матэрыялу, амаль поўнасцю адсутнічае навык работы з кнігай. Акрамя таго, у большасці лёгкадумныя адносіны да будучай прафесіі. З 985 студэнтаў факультэта сёлета толькі 71 здаў зімовую сесію на «выдатна», 219 — на «добра» і «выдатна», 121 — на «добра». Ужо гэты факт сведчыць, што менш чым 50% студэнтаў адпавядаюць сучаснаму ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў. А калі дадаць, што 103 чалавекі па выніках сесіі атрымалі нездавальняючыя адзнакі, а 64 толькі пасрэдныя, то выявіцца надзвычай трывожная карціна.

Як жа непадрыхтаваныя школьнікі сталі студэнтамі? Мэтавы і пазаконкурсны прыём гарантавалі ім паступленне ў студэнты пры пасрэдных ведах. Ды дадатковыя балы за стаж, за пражыванне ў сельскай мясцовасці спрыялі залічэнню ва універсітэт. Такое фарміраванне кантынгенту студэнтаў і прывяло да страты прэстыжу вышэйшай адукацыі, яе дэвальвацыі. Не лепшай была сітуацыя і ва універсітэце, бо «план» выпуску спецыялістаў адпавядаў колькасці залічаных пяць гадоў назад на першы курс. Вось і падстройваліся гадамі выкладчыкі да слабага студэнта, пра яго клапаціліся, забываючы пра моцных, здольных, якім яўна недадавалі ведаў, стрымлівалі іх творчы патэнцыял.

Перабудова вышэйшай школы адкрыла вялікія магчымасці для ўдасканалення вучэбнага працэсу і паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, у прыватнасці, для народнай асветы. Гэтаму спрыяюць павышэнне і дыферэнцыяцыя стыпендый з улікам паспяховасці, дэмакратызацыя кіравання і прадстаўленне большых правоў пры складанні вучэбных планаў і арганізацыі навучання. У сувязі з гэтым перад калектывам выкладчыкаў пастаўлена надзвычай важная задача — фарміраванне на факультэце культу ведаў, культу кнігі. А на гэта з цяжкасцю настройваюцца і студэнты, і выкладчыкі. Выратавальная пасрэдная ацэнка задавальняе ў многіх выпадках і тых, і другіх.

Бачачы нізкую пісьменнасць студэнтаў, мы ўвялі чатыры гады назад дыктант па рускай мове. Праціўнікаў такой меры было хоць адбаўляй. Цяпер гэта ўзаконена адпаведным загадам. У красавіку мінулага года паставілі на савеце факультэта пытанне аб увядзенні дзяржаўнага экзамена. Пярэчанні былі такія, што рашэнне прыняць не ўдалося. І толькі падтрымка рэктарата дапамагла

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## Да пленума абкома КПБ

**ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!**

**У абласной партыйнай арганізацыі праходзяць пленумы гаркомаў, райкомаў партыі з абмеркаваннем вынікаў работы лютаўскага (1988 г.) Пленума ЦК КПСС. Гэта пытанне выносіцца на разгляд і чарговага пленума абкома КПБ, які адбудзецца ў красавіку.**

**Мы запрашаем партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў, гаспадарчых кіраўнікоў і спецыялістаў, работнікаў усіх галін народнай гаспадаркі вобласці, камуністаў і беспартыйных прыняць актыўны ўдзел у яго падрыхтоўцы. Разлічваем на самы творчы ўдзел у гэтай справе выкладчыкаў вышэйшай і сярэдняй школы, усёй педагагічнай грамадскасці вобласці.**

**Просім вас шчыра і прынцыпова выказацца аб стылі і метадах работы партыйных камітэтаў і арганізацый па ідэалагічнаму забеспячэнню перабудовы, па праблемах ідэйна-выхаваўчай работы з людзьмі. Будзем удзячныя за канструктыўныя прапановы па далейшаму развіццю народнай асветы, удасканаленню матэрыяльнай базы, вучэбна-выхаваўчага працэсу, арганізацыі вучобы і перападрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў, паляпшэнню кіравання адукацыяй, вырашэнню бытавых і іншых наспеўшых праблем. Чакаем дзелавых меркаванняў па павышэнню ролі працоўных калектываў, камсамола, сям'і, усіх грамадскіх арганізацый у навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення.**

**Вашы заўвагі і прапановы дапамогуць бюро абкома партыі глыбей, больш ўсебакова і прынцыпова ацаніць зробленае, сканцэнтраваць намаганні абласной партыйнай арганізацыі на нявырашаных пытаннях, вызначыць канкрэтную праграму нашых далейшых дзеянняў.**

**Прапановы, крытычныя заўвагі і пажаданні просім накіроўваць у абком КПБ і рэдакцыю газеты «Гомельская праўда» з адзнакай «Да пленума абкома партыі».**

## КАНФЕРЭНЦЫІ

# А. С. МАКАРАНКА І СУЧАСНАСЦЬ

По такой тэме ў Гомельскім педагагічным вучылішчы прайшла абласная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага савецкага педагога. У ёй прынялі ўдзел і выступілі з дакладамі і паведамленнямі выкладчыкі сярэдніх школ, прафтэхвучылішчаў, тэхнікумаў і ВНУ Гомельшчыны, савецкія, партыйныя і камсамольскія работнікі.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў і вёў пленарнае пасяджэнне старшыня Гомельскага абласнога савета Педагагічнага таварыства БССР загадчык кафедры філасофіі ГДУ прафесар У. М. Калмыкоў.

На пленарным пасяджэнні сваімі думкамі аб велізарным значэнні педагагічнай спадчыны А. С. Макаранкі для перабудовы сістэмы навучання і выхавання вучняў ва ўмовах сучаснай школы падзялілася сакратар Гомельскага райкома КПБ Г. І. Багдановіч. Даклад дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ, Героя Сацыялістычнай Працы М. А. Дзмітрыева быў прысвечаны значэнню педагагічных ідэй А. С. Макаранкі для фарміравання педагагічнага майстэрства настаўнікаў і студэнтаў. Выкладчыца СПТВ-30 г. Гомеля Н. А. Гардзеенка падзялілася вопытам творчага асэнсавання і ўкаранення ў практыку работы прафтэхвучылішчаў педагагічнай сістэмы А. С. Макаранкі. Змястоўным быў даклад сакратара Светлагорскага гаркома ЛКСМБ Н. І. Каханчык аб увасабленні педагагічных ідэй А. С. Макаранкі ў дзейнасць камсамольскіх арганізацый навучальных устаноў і вытворчых калектываў.

Абмеркаванне вядучых праблем навуковай спадчыны і практычнага вопыту А. С. Макаранкі праходзіла на секцыйных пасяджэннях. Вялікую цікавасць удзельнікаў канферэнцыі выклікалі выступленні дацэнтаў нашага універсітэта загадчыкаў кафедр А. А. Рубана і Л. І. Нядзеля па пытаннях патрыятычнага і эстэтычнага выхавання моладзі ў святле ідэй А. С. Макаранкі.

**Ф. КАДОЛ,**
**дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі, удзельнік канферэнцыі.**

# БАГАЦЦЕ ВОПЫТУ І ДУМКІ

Усім вядома імя педагога-наватара, пісьменніка А. С. Макаранкі. Але мала хто толкам можа расказаць пра справу Антона Сямёнавіча. На доўгія гады яго каштоўны вопыт у выхаванні новага чалавека быў забыты. Таму ўдзельнікі канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння А. С. Макаранкі, якая прайшла на фізічным факультэце, спрабавалі з розных бакоў падысці да вывучэння надзвычай цікавай асобы савецкага педагога.

Дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Ф. У. Кадол, які выступіў на канферэнцыі, звярнуў увагу на наватарскі характар А. С. Макаранкі. З вялікай разнастайнасці тэорый выхавання — ад аўтарытарнага да свабоднага, якія існавалі ў першыя гады Савецкай улады ў педагогіцы, А. С. Макаранка змог знайсці свой асабісты падыход да праблемы выхавання: «Як мага больш патрабаванняў да чалавека і як мага больш павагі да яго».

Трэцякурснік С. Міхасёў цікава расказаў аб жыццёвым шляху і педагагічнай дзейнасці А. С. Макаранкі. У 17 гадоў ён становіцца настаўнікам, а ў 32 — загадваў калоніяй. Восем мільёнаў дзяцей апынуліся на вуліцы. Галодныя, хворыя, разутыя, страціўшыя дом і бацькоў — іх трэба было не проста накарміць і апрануць, але вярнуць з «дна жыцця» у грамадства, перавыхаваць, каб яны сталі дастойнымі грамадзянамі сваёй краіны.

Пра Макаранку-літаратара на канферэнцыі расказала студэнтка 1-га курса Алена Гасак.

З расказам аб тым, як прынцыпы педагогікі А. С. Макаранкі, дапамаглі ў рабоце з былымі беспрытульнікамі ў камбінаце рабочай адукацыі, выступіў дацэнт В. Р. Сіманаў.

Выдатны педагог і пісьменнік неабходны нам як наша гісторыя, як нявыкарыстанае багацце вопыту і думкі.

**Т. АЛФЁРАВА,**
**студэнтка 3-га курса фізічнага факультэта.**



**Паездка членаў педагагічнага клуба універсітэта «Дыафант» па месцах, звязаных з жыццём і дзейнасцю А. С. Макаранкі, прынесла ім радаснае адкрыццё — у Гомелі жыве Г. К. Герашчанка, былая выхаванка камуны імя Дзяржынскага, якой кіраваў выдатны савецкі педагог. У дні святкавання 100-гадовага юбілею педагога і пісьменніка, Галіна Канстанцінаўна была жаданым госцем у студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ.**
Фота Л. Акінчыц.

# узаемнае абагачэнне

праблеме абітурыента. Хто да нас паступае, з якім балам? Канешне, гэта вельмі важна. Але ці з'яўляецца бал тым крытэрыем, які вызначае будучае студэнта ва універсітэце?

Быў час (канец 40-х і 50-я гады), калі ў Гомельскі педінстытут на фізіка-матэматычны факультэт паступалі ў большасці тыя, хто закончыў сельскія школы. Бал у іх быў нізкі, мала хто з іх атрымліваў стыпендыю, таму што закон не даваў права выплачваць яе тым, хто меў «нездавальняюча». Нялёгка жылося студэнту таго часу: амаль паўгалодныя, на заняткі прыходзілі ў ватоўках і валёнках (у аўдыторыях часта была тэмпература, пры якой замярзала чарніла). Але якім высокім было іх маральнае аблічча, як імкнуліся яны да ведаў! Да трэцяга курса гэтыя «ціхія» юнакі і дзяўчаты дасягалі ў вучобе ўзроўню студэнтаў, якія паступілі ў інстытут з высокім балам. А як актыўна яны ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці, як бурна і па-дзелавому праходзілі камсамольскія і прафсаюзныя сходы, на якіх абмяркоўваліся пытанні вучобы, дысцыпліны, самакіравання! Было шмат дыскусій, дыспутаў па пытаннях этыкі, маралі і г. д. Тады педагагічны калектыў факультэта ўсе свае намаганні прыкладаў да таго, каб задаволіць прагу ведаў студэнтаў і дапамагаў ім у арганізацыі нармальных умоў жыцця.

Заканчваючы інстытут, студэнты з глыбінкі ехалі на работу ў сельскія школы і выдатна там працавалі, выхоўвалі падрастаючае пакаленне. Многія са студэнтаў, якія наведвалі навуковыя семінары па інтарэсах, рыхтаваліся да навуковай працы, паступалі ў аспірантуру, паспяхова заканчвалі яе, станавіліся вучонымі.

Апошнія гады жыцця нашай ВНУ паставілі перад педагагічным калектывам больш складаныя задачы. Калі раней галоўным было задавальненне патрэбы студэнтаў у ведах, дык зараз стаіць задача **па выхаванню** ў студэнтаў патрэбы ведаў. Гэта важная сацыяльная задача. Цяжкасці ў яе вырашэнні абумоўлены інерцыяй у дзеянні прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці, якая адыграла негатыўную ролю ў выхаванні моладзі. Падарвана прэстыжнасць прафесіі інжынера, настаўніка, урача, некаторых іншых спецыяльнасцей інтэлектуальнай працы, якая стала нізка аплочвацца ў параўнанні з заробкам рабочых, калгаснікаў. Хуткі рост матэрыяльнага дабрабыту гэтых катэгорый працоўных і пэўнае адставанне іх культурнага развіцця выклікалі рад іншых негатыўных з'яў у жыцці нашага грамадства, якія адбіліся на маральным абліччы многіх грамадзян, што, натуральна, было ўнесена і ў ВНУ краіны. А гэта не магло не адбіцца і на духоўным свеце тых, хто абавязаны выхоўваць студэнтаў.

На фізічным факультэце, напрыклад, з 200 супрацоўнікаў усяго 48 заняты выкладчыцкай працай, большасць жа заняты ў сферы гасдагаворнай дзейнасці. Многія і з выкладчыкаў займаюцца ёй, што адцягвае іх увагу і час ад прамых абавязкаў. А колькі часу і ўвагі кіраўнікоў кафедр, дэканата і партбюро адводзіцца на забеспячэнне выканання планаў па гасдагаворах на шкоду вучэбна-выхаваўчай рабоце! І ў гэтых умовах на факультэце, дзе каля 500 студэнтаў, няма стаўкі намесніка дэкана па вучэбнай рабоце. Ці нармальна гэта? Можна ўявіць, як могуць вырашацца на партыйных сходах факультэта пытанні выхавання і навучання, калі абсалютная большасць прысутных на іх да гэтай работы не маюць дачынення. Але галоўнае, што гасдагаворная дзейнасць выклікае зноў праблемы меркантыльнасці, што не можа не адбіцца на вучэбна-выхаваўчай рабоце, таму што вельмі мала застаецца тых педагогаў, якія заняты выхаваннем і навучаннем.

Перабудовай вышэйшай школы прадугледжваецца даследчая работа педагагічных калектываў у дапамогу вытворчасці, але яна на першае месца ставіць іх дзейнасць, накіраваную на падрыхтоўку ва універсітэце высокакваліфікаваных спецыялістаў-даследчыкаў шырокага профілю, якія будуць здольны працаваць і на вытворчасці, і ў сферы народнай адукацыі. Важнасць апошняга чотюа вызначана лютаўскім (1988 г.) Пленумам ЦК КПСС.

**В. СІМАНАЎ,**
**член савета ветэранаў вайны і працы ГДУ, дацэнт.**

*Навуковая экспедыцыя*

# МОЎНАЯ СІТУАЦЫЯ НА ПАЛЕССІ

**У мінулым годзе ў Лельчыцах і ў двух цэнтрах сельсаветаў — вёсках Дуброва і Стадолічы працаваў навукова-экспедыцыйны атрад студэнтаў філалагічнага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ.**

Напэўна, многія жыхары раённага цэнтра, работнікі прадпрыемстваў і ўстаноў гарадскога пасёлка сустракалі маладых дзяўчат, якія звярталіся да іх з трохі нязвычнымі пытаннямі. Напрыклад, прасілі адказаць, на якой мове — беларускай ці рускай — яны лічаць за лепшае чытаць кнігі, глядзець тэлепраграмы, слухаць радыё, пісаць пісьмы — асабістыя і дзелавыя; на якой мове для іх зручней размаўляць з сябрамі, з суседзямі, у грамадскіх месцах

А калі студэнты прыходзілі ва ўстановы і арганізацыі, яны цікавіліся тым, якая мова выкарыстоўваецца працаўнікамі ў штодзённых зносінах, у размовах на прафесіянальныя тэмы, у афіцыяльнай перапісцы; якой мовай карыстаюцца на агульных сходах, на пасяджэннях, як размаўляюць з наведвальнікамі, калі яны звяртаюцца па-беларуску.

На гэтыя і іншыя пытанні, як правіла, студэнты атрымлівалі падрабязныя адказы. Людзей аднак цікавіла: навошта студэнтам спатрэбілася такая інфармацыя, для чаго ў іх такія інтарэсы?

Аднак здзіўленне ў жыхароў Лельчыц хутка знікала. бо студэнты, перш за ўсё, стараліся растлумачыць сэнс сваёй работы. Больш таго, здзіўленне часам змянялася зацікаўленасцю і нярэдка... збянтэжанасцю, бо пытанні здаралася, былі нялёгкія.

Навуковы экспедыцыйны атрад Гомельскага універсітэта выконваў заданне Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук БССР па вывучэнню моўнай сітуацыі ў розных кутках Беларусі, якая характарызуецца інтэнсіўным развіццём беларуска-рускага двумоўя.

У Лельчыцкім раёне, напрыклад (без уліку гарадскога пасёлка), дзе пераважную колькасць насельніцтва складаюць беларусы, рускую мову лічаць роднай 360 чалавек, у тым ліку 198 рускіх, 11 беларусаў і 151 чалавек іншай нацыянальнасці. У Лельчыцах яшчэ 460 чалавек лічаць роднай рускую мову, з гэтай колькасці — 420 рускіх, 10 беларусаў і 30 жыхароў іншай нацыянальнасці. Цікава, што згодна са статыстычнымі табліцамі, 2460 беларусаў з Лельчыц адзначылі, што яны свабодна гавораць, чытаюць і пішуць па-руску.

Спецыфіка двумоўя ў Лельчыцкім раёне паказальная не толькі ў агульным статыстычным маштабе. Вельмі цікавыя ў гэтым плане спецыяльныя анкеты, якія высвятляюць характар двумоўя ва ўстановах і на прадпрыемствах, а таксама ў рабоце пярвічных партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў.

Высветлілася, што больш чым у 40 установах і арганізацыях Лельчыц у штодзённых зносінах руская і беларуская мовы выкарыстоўваюцца ў аднолькавай ступені (руская мова — у 25 установах, беларуская — у 26, прычым у многіх з іх абедзве мовы выкарыстоўваюцца адначасова). На сходах і нарадах часцей гавораць па-руску (у 28 установах і арганізацыях супраць 9), а ў справаводстве амаль паўсюдна выкарыстоўваецца толькі руская мова.

У сельскай мясцовасці (вёскі Дуброва і Стадолічы) беларуская мова значна пераважае ў штодзённых адносінах, яе выкарыстоўваюць разам з рускай у размовах на прафесіянальныя тэмы, на нарадах і сходах. У ходзе сацыяльна-лінгвістычнага даследавання выяўляўся характар двумоўя ў рабоце 22 пярвічных партыйных, 24 прафсаюзных і 36 камсамольскіх арганізацый Лельчыц і раёна. У штодзённай рабоце большасці пярвічных фарміраванняў выкарыстоўваецца як выключна руская мова, так і беларуская разам з рускай. Па-беларуску амаль паўсюдна размаўляюць тады, калі ў адпаведны орган звяртаецца наведвальнік, які карыстаецца беларускай мовай.

Некаторыя пярвічныя арганізацыі выкарыстоўваюць беларускую мову (разам з рускай) на канферэнцыях, пасяджэннях і сходах. Усё справаводства вядзецца ў асноўным на рускай мове, на гэтай жа мове пераважна выпускаецца і насценны друк.

Самымі шматлікімі (больш 500) аказаліся індывідуальныя анкеты. Галоўная мэта гэтай часткі задання — высветліць, якой мове аддаюць перавагу асобныя грамадзяне ў штодзённым жыцці.

Большасць з апытваемых валодаюць як беларускай, так і рускай мовамі. Стан валодання рускай мовай у анкетуемых беларусаў даволі высокі: яны чытаюць, пішуць і свабодна гавораць па-руску або разумеюць, гавораць і чытаюць, але не пішуць. Сфера выкарыстання беларускай мовы (амаль 90 працэнтаў усіх індывідуальных анкет) — пераважна бытавыя абставіны, размовы з роднымі, сябрамі, знаёмымі. Тут беларуская мова часта выкарыстоўваецца разам з рускай.

Вельмі важны паказчык— на якой мове людзі лічаць за лепшае чытаць кнігі, слухаць радыёперадачы, глядзець тэлепраграмы, пісаць пісьмы. З больш чым 500 апытваемых 56 чытаюць кнігі пераважна на беларускай мове, 105 — на беларускай і рускай; 47 чалавек лічаць за лепшае глядзець тэлепраграмы выключна на беларускай мове, 150 чалавек — на беларускай і рускай мовах; 53 чалавекі звычайна слухаюць радыё на беларускай мове, 160 чалавек — на рускай і беларускай; нарэшце, пісьмы па-беларуску пішуць 58 чалавек, а яшчэ 32 — па-руску і па-беларуску аднолькава.

Неабходна сказаць, што большасць з тых інфармантаў, якія лічаць сваёй роднай мовай рускую, ужываюць шмат беларускіх слоў. У іх мове выразна адчуваюцца спецыфічныя беларускія гукі (цвёрды ч, працяглы г і інш.), яны ставяць націск у многіх словах так, як ён стаіць у гэтых жа словах у беларускай мове, яны ўжываюць і некаторыя граматычныя формы, больш характэрныя для беларускай мовы.

І наадварот, тыя, хто лічаць сябе беларусамі, а беларускую мову — сваёй роднай, нярэдка карыстаюцца словамі-русізмамі. Аб гэтым сведчаць анкеты-тэсты, сабраныя ў час экспедыцыі.

Усе матэрыялы, якія высвятляюць моўную сітуацыю ў Лельчыцкім раёне, перадаюцца ў Інстытут мовазнаўства пры Акадэміі навук БССР.

**А. РОГАЛЕЎ,**
**аспірант кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

*Кнігі нашых вучоных*

# НАСТАЎНІК БУДЗЕ ЎДЗЯЧНЫ

У магазінах гор. Гомеля і вобласці днямі з'явілася цікавая і карысная кніжка дацэнта-метадыста нашага універсітэта В. І. Смыкоўскай «Развіццё мовы вучняў на ўроках літаратуры». Як вядома, развіццё звязнай вуснай і пісьмовай мовы школьнікаў, выпрацоўка ў іх навыкаў правільнага выкарыстання моўных сродкаў — адна з галоўных і надзвычай актуальных задач навучання і выхавання моладзі на сучасным этапе.

«Школа павінна выпускаць пісьменных людзей, — адзначана ў праграме па мове і літаратуры, — якія добра валодаюць беларускай літаратурнай мовай. Для гэтага неабходна ўдасканальваць і творча выкарыстоўваць разнастайныя эфектыўныя сродкі і метады навучання і выхавання, актывізаваць работу вучняў, выклікаючы ў іх любоў і цікавасць да ведаў і заняткаў, развіваць іх самастойнасць і ініцыятыву».

Як паказала знаёмства з кнігай В. І. Смыкоўскай, плённае і эфектыўнае вырашэнне названай задачы з улікам сучасных патрабаванняў шмат у чым залежыць не толькі ад настаўнікаў, але і ад метадыстаў рэспублікі, інтарэс якіх да праблем развіцця мовы сёння, як ніколі, надзвычай неабходны і своечасовы.

Цікавасць жа аўтара рэцэнзуемага дапаможніка да моўнага развіцця вучняў, як нам вядома, даўняя і пастаянная. Пад кіраўніцтвам В. І. Смыкоўскай даследаваннем гэтай важнай праблемы займаюцца студэнты-гурткоўцы, якія правялі ў школах горада Гомеля і вобласці анкетаванне, падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю «З любоўю да роднага слова», сабралі і сістэматызавалі багаты фактычны матэрыял, які апрабіравалі ў навуковых дакладах на факультэце і рэспубліцы. Так што даследаванне В. І. Смыкоўскай узнікла не на голым месцы, а мае пад сабой трывалую навуковую і метадычную аснову. Прапанаваныя яго рэкамендацыі і заданні, адрасаваныя настаўнікам і вучням, апрабіраваны і ў час практычных і лабараторных заняткаў па методыцы выкладання літаратуры са студэнтамі, і ў час іх педагагічнай практыкі ў школе.

Ці ўсё ўдалося аўтару ў яе кнізе? Ці адпавядаюць асноўныя палажэнні дапаможніка тым высокім патрабаванням, што прад'яўляюцца сёння да настаўнікаў-славеснікаў?

Каб адказаць на гэтыя пытанні, звернемся да зместу рэцэнзуемай працы.

У першым яе раздзеле «Задачы і змест работы па развіццю мовы» абгрунтаваны мэты і задачы дзейнасці настаўніка па развіццю мовы вучняў ва ўмовах ажыццяўлення школьнай рэформы з улікам тых адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых задач, што павінны ажыццяўляцца на ўроках літаратуры.

У другім раздзеле работы «Выразнае чытанне, завучванне на памяць і развіццё мовы вучняў» акрэслена спецыфіка гэтых урокаў у рабоце па фарміраванню навыкаў выразнага чытання. Аўтар не проста канстатуе тое ці іншае палажэнне сваёй сістэмы, а прасочвае, якія тэмы школьнай праграмы найбольш прыдатныя для такой работы, якія прыёмы навучання з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі ў складаным і працяглым працэсе выхавання вымаўленчай культуры і чаму? Яна пры гэтым абгрунтоўвае неабходнасць іх мэтанакіраванага прымянення ў рабоце настаўніка, абапіраючыся на такія агульнадыдактычныя прынцыпы, як навуковасць, сістэмнасць, пераемнасць, паслядоўнасць і г. д.

На багатым фактычным матэрыяле трэцяга раздзела аўтар кнігі паказвае, як найлепш арганізаваць на ўроках літаратуры IV—VIII і VIII—X-х класаў узбагачэнне слоўніка вучняў, забяспечыць яго багацце і сістэматычнае папаўненне. Тут прыводзяцца разнастайныя практыкаванні і заданні, трэніровачныя работы, якія дапамогуць настаўніку паглыбіць і канкрэтызаваць веды вучняў па лексіцы, стылістыцы, што ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць развіццю агульнай культуры маўлення моладзі.

Даючы тыя ці іншыя парады і рэкамендацыі настаўніку па аваладанню методыкай работы над вуснымі і пісьмовымі пераказамі, у IV раздзеле аўтар дапаможніка слушна робіць акцэнт на выхаваўчым аспекце гэтай работы, практычна абгрунтоўвае неабходнасць не толькі колькаснага, але і якаснага ўдасканалення навыкаў развіцця звязнай мовы вучняў на кожнай новай ступені навучання.

Не выпадкова, відаць, у дапаможнік уведзены раздзел «План, тэзіс, канспект». Менавіта праца вучняў на ўроках і дома над гэтымі відамі творчай работы будзе садзейнічаць большай актывізацыі іх самастойнасці.

Асаблівую цікавасць уяўляюць самыя аб'ёмныя і таму самыя грунтоўныя раздзелы кнігі «Сачыненні — эфектыўны метад развіцця моўнай культуры» і «Урокі развіцця мовы», напісаныя ў адпаведнасці з канцэпцыяй развіццёвага навучання. Большасць заданняў і пытанняў да іх арыентаваны на развіццё творчасці вучняў, самастойнасці ў ацэнках і вывадах, выхаванне ўдумлівага, свядомага чытача-грамадзяніна. Такі падыход уяўляецца нам надзвычай перспектыўным: ён садзейнічае не толькі маральнаму, патрыятычнаму выхаванню школьнікаў, але і фарміруе ў іх добрыя эстэтычныя густы, высокую маўленчую культуру.

Сённяшняга настаўніка-філолага цікавіць больш за ўсё канкрэтны падыход аўтараў метадычных дапаможнікаў да такой актуальнай праблемы, як развіццё мовы, канкрэтныя шляхі, метады, прыёмы найлепшай рэалізацыі адукацыйных, выхаваўчых, ідэалагічных, пазнаваўчых і іншых магчымасцей урока літаратуры. Нельга ў гэтым адмовіць аўтару рэцэнзуемай кнігі. Яна ўзялася за надзвычай складаную, шматаспектную праблему, зрабіла і, скажам, удалую спробу яе вырашэння.

Можна часам не пагадзіцца з аўтарам у яго ацэнцы той ці іншай літаратурнай з'явы. Нешта можна аспрэчваць; сёе-тое патрабуе ў кнізе ўдакладнення, а часам і больш грунтоўнага раскрыцця. Але ў цэлым выкарыстанне дапаможніка В. І. Смыкоўскай у штодзённай рабоце настаўнікаў будзе садзейнічаць павышэнню ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай літаратуры, акажа неацэнную дапамогу славеснікам у рэалізацыі ідэі ўзмацнення практычнай накіраванасці ўрокаў роднай літаратуры.

**У. САБАЛЕНКА,**
**загадчык кафедры рускай літаратуры.**
**В. ГЕНАШ,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# ЗАВЯРШЫЛАСЯ СПАРТАКІЯДА «ЗДАРОЎЕ»

Спаборніцтвамі аматараў рыбнай лоўлі завяршылася спартакіяда «Здароўе» выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ. У апошнім відзе яе праграмы прыняло ўдзел 6 каманд. Па невядомых прычынах не былі прадстаўлены фізічны і эканамічны факультэты.

У састаў кожнай каманды ўваходзіла па тры рыбакі. Яны спаборнічалі на вадаёме, што каля вёскі Сцюдзёная Гута. Дажджлівае надвор'е не спрыяла добраму клёву. Аднак і пры такіх умовах спрактыкаваныя рыбакі паказалі нядрэнныя вынікі. Самы буйны экземпляр злоўленай плоткі аказаўся ў супрацоўніка кафедры фізвыхавання М. Карабанава. Найбольшую колькасць рыбы вылавіў супрацоўнік біяфака Ю. Жураўлёў.

У камандным заліку месцы размеркаваліся ў наступным парадку: біяфак, геафак, факультэт фізвыхавання, матфак, АГЧ, гістфіл.

Пераможцы спаборніцтваў узнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі.

**У. БАРКОЎ,**
**суддзя спаборніцтваў.**

# НОВАЕ АБ КАМАНДЗІРОЎКАХ

Савет Міністраў СССР прыняў пастанову аб службовых камандзіроўках у межах СССР, якая ўведзена ў дзеянне з 1-га красавіка г. г.

Цяпер адменена лімітаванне грашовых сродкаў, якія расходуюцца на службовыя камандзіроўкі аб'яднаннямі, прадпрыемствамі і арганізацыямі. Але органам упраўлення, а таксама ўстановам і арганізацыям, якія знаходзяцца на бюджэце, ліміты расходаў на гэтыя мэты будуць устанаўлівацца міністэрствамі і ведамствамі СССР, Саветамі Міністраў саюзных рэспублік — без паведамлення банку.

Кіраўнік прадпрыемства і арганізацыі можа дазволіць службовую паездку на тэрмін да 40 сутак, а ў вышэйстаячыя органы дзяржаўнага і гаспадарчага ўпраўлення — да 5 дзён. Камандзіраваным работнікам кампенсуюцца расходы па камандзіроўцы: праезд да месца камандзіроўкі і назад паветраным, чыгуначным, марскім, рачным, міжгароднім аўтамабільным транспартам аплочваецца з уключэннем страхавых плацяжоў і паслуг па папярэдняму продажу білетаў; размер сутачных павялічан да 3 руб. 50 кап., а ў раёнах Крайняй Поўначы і ў прыраўнаваных да іх мясцовасцях, а таксама ў Хабараўскім, Прыморскім краях і ў Амурскай вобласці — да 4 руб. 50 кап.; кампенсацыя расходаў на найму жылога памяшкання павялічана да 5 рублёў у суткі ў Маскве, Ленінградзе, сталіцах саюзных рэспублік, 4 рублі ў суткі ў іншых гарадах і раённых цэнтрах і 3 рублі ў суткі ў іншых населеных пунктах.

Разам з гэтым кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый дадзена права ў выпадках, калі размер указаных расходаў вядомы загадзя, дазваляць іх аплату (са згоды работніка) без прадстаўлення пацвярджаючых дакументаў.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

# ДА ЎВАГІ ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у красавіку 1988 г.**

**1. Быць вернымі запаветам Ільіча.** (Да 118-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна).

Матэрыял публікуюць усе газеты.

**2. Патэнцыял кааперацыі — справе перабудовы.**

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці патрабаванні, вывады і ўстаноўкі, змешчаныя ў выступленні Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова на IV Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў (Гл. газету «Правда» за 24 сакавіка 1988 г.).

**3. Усе — на суботнік!** (Аб актыўнай падтрымцы працаўнікамі горада і вёскі ініцыятывы перадавых калектываў правесці 16 красавіка Ленінскі камуністычны суботнік).

Матэрыял публікуюць усе газеты.

**4. Планы паскарэння — у штодзённую практыку.** (Крытычна прааналізаваць вынікі вытворча-эканамічнай дзейнасці свайго прадпрыемства, гаспадаркі за першы квартал г. г., паказаць эфектыўныя шляхі ўдасканалення гаспадарча-разліковых адносін, паглыблення рабочага самакіравання, вырашэння сацыяльных пытанняў).

Матэрыял публікуе газета «Звязда». Гл. таксама часопіс «Агитатор» №№ 4 і 5 за 1988 г.

**5. Жыць па законах брацтва.** (Свяшчэнны патрыятычны абавязак кожнага савецкага чалавека — берагчы і ўмацоўваць брацкую дружбу і інтэрнацыянальнае адзінства народаў СССР — рашаючая ўмова ажыццяўлення задач рэвалюцыйнага абнаўлення грамадства).

Пры падрыхтоўцы і правядзенні палітінфармацый і гутарак на гэту тэму рэкамендуецца выкарыстаць матэрыялы, апублікаваныя ў газетах «Правда» за 21, 22, 23 і 24 сакавіка, «Известия» за 22 і 24 сакавіка, часопісе «Политический собеседник» № 3 за 1988 год.

**6. Больш рашуча ўсталёўваць здаровы ўклад жыцця.** (На канкрэтных прыкладах і фактах паказаць рэзультатыўнасць работы па выкараненню п'янства, самагонаварэння, наркаманіі і іншых заган, аздараўленню быту і адпачынку людзей).

У гутарках на гэту тэму рэкамендуецца выкарыстаць палажэнні і вывады пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб рабоце Саветаў народных дэпутатаў Малдаўскай ССР па ўзмацненню барацьбы з п'янствам і наркаманіяй», апублікаванай у газеце «Правда» 10 сакавіка г. г. Гл. таксама артыкулы ў часопісах «Политическое образование» № 4, «Партийная жизнь» № 5 за 1988 год.

**7. Дружбе і супрацоўніцтву — мацнець.** (Да вынікаў візіту Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў Сацыялістычную Федэратыўную Рэспубліку Югаславію).

Матэрыялы апублікаваны ў цэнтральным і рэспубліканскім друку.

**8. Капіталізм 80-х: спусташальны дастатак.** (Аб вострых праблемах у аграрным сектары эканомікі капіталістычных краін).

Матэрыял апублікаван у штотыднёвіку «За рубежом» № 12 за 1988 год.

*Чырвоны святлафор*

# КАЛІ ДЗЕЦІ НА ВУЛІЦЫ...

Спачатку некалькі лічбаў. На вуліцах і дарогах Гомельскай вобласці ў гэтым годзе адбылося больш 20 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх адно дзіця загінула і дваццаць атрымалі траўмы. Гэтыя лічбы лепш за ўсякія словы пераконваюць у тым, што праблема дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму сапраўды існуе і патрабуе самага сур'ёзнага падыходу да рашэння звязаных з ёй пытанняў. У гутарцы з дзецьмі высняецца, што большасць з іх правілы дарожнага руху ведаюць нядрэнна. Але вось прымяніць гэтыя веды на практыцы маленькія пешаходы вельмі часта не ўмеюць. І не трэба чакаць, пакуль дзіця набудзе гэтыя навыкі на асабістым вопыце — часам такі «вопыт» каштуе вельмі дорага. Лепш, калі звычку свядомага падпарадкавання правілам будуць прывіваць дарослыя. На жаль, не ўсе яны разумеюць важнасць такога выхавання.

Нярэдка даводзіцца бачыць жанчыну, якая спяшаецца пераходзіць вуліцу, а за ёй ледзь паспявае малыш. На святлафоры — чырвонае святло, а маці спяшаецца, паскарае крок. «Мама, а нам у садзіку выхавацельніца казала, што на чырвонае святло дарогу пераходзіць нельга», — гаворыць малыш. «Многа яна разумее!» — чуецца ў адказ. Малыш у разгубленасці. Маці ёсць маці — ёй трэба верыць, але і выхавацельніцы — таксама. І вось у душы дзіцяці нараджаецца першае ігнараванне законаў вуліц і дарог. А потым надыходзіць дзень, калі ён, як і дарослыя, пераходзіць вуліцу там, дзе забаронена, ідзе на чырвонае святло. І часта такія парушэнні заканчваюцца трагедыяй. Так, вучаніца 2-га класа СШ № 20 г. Гомеля Святлана Бляўская нечакана выбегла на праезную частку вуліцы Б. Хмяльніцкага з-за транспартнага сродку і была збіта аўтамабілем. Дзяўчынка атрымала сур'ёзныя траўмы. У аналагічнай сітуацыі траўмы атрымалі другакласнік СШ № 31 Алег Грамыка, іншыя школьнікі.

Як выхаваць навыкі бяспекі? Неабходна навучыць дзіця чатыром правілам. Першае: сачы за вуліцай! Трэба, каб яно бачыла ў транспартных сродках павышаную бяспеку. Дзіцяці неабходна паказаць, як з-за перашкоды нечакана выязджаюць машыны. Уявіце сабе, што вы падыходзіце з дзіцем да аўтобуснага прыпынку, які знаходзіцца на другім баку вуліцы. Там ужо стаіць аўтобус. Замест таго, каб стрымгалоў імчацца да яго, растлумачце дзіцяці, наколькі небяспечныя такія дзеянні. Другое: не спяшайся! Пераходзіць вуліцу трэба спакойна, уважліва гледзячы па баках. Трэцяе: на праезнай частцы — максімум увагі. За бардзюрам тратуара пачынаецца свет скорасці і нечаканасці. Дзеці абавязаны рэагаваць на гэту мяжу. Чацвёртае: кантралюруй свае дзеянні. У дамашняй абстаноўцы дзіця рухаецца аўтаматычна, можа думаць аб нечым пабочным. А на вуліцы гэта да дабра не давядзе.

**А. РАГАЎЦОЎ,**
**ст. інспектар па прапагандзе і агітацыі ДАІ УУС, старшы лейтэнант міліцыі.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Дэканат факультэта фізічнага выхавання, кафедра лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, спартклуб выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку названай кафедры ПРАЦКО Юрыю Піліпавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 02287

Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 2000 экз. Заказ 234.